Источник: **«Звязда» - 2013-04-27**

# Культурная беражлівасць

### Дзеля чаго рыхтуецца шматтомнае выданне "Гісторыя культуры Беларусі"?

Сутнасць слова "беражлівасць" сёлета тлумачаць усе. У кожнага знаходзіцца свая інтэрпрэтацыя. Але людзям, якія працуюць у культурнай сферы ці маюць дачыненне да яе, даўно зразумела: толькі зберагаючы тое, што зроблена папярэднікамі ці ўсім ходам гісторыі, можна рухацца наперад і працягваць узбагачаць. І не год, і не дзесяцігоддзе ўжо беражлівасць стала, як ні дзіўна, залогам развіцця айчыннай культуры: праз беражлівае стаўленне да традыцый беларускага народа, праз працу, якая накіравана на іх захаванне і папулярызацыю. І абсалютна зразумела, чаму гэтая тэма ўзнікла на Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў". Навукоўцы, якія сабраліся ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, — людзі апантаныя і зацікаўленыя кожны ў сваёй тэме, сферы ці відзе мастацтва. Больш за 190 чалавек з самых розных краін прынялі ўдзел у абмеркаванні праблем і стану сучаснай культуры. Было пра што паспрачацца, было што ўдакладніць. Але немагчыма было абмінуць галоўнае. Немагчыма было абысціся без размовы пра глебу, на якой узводзіцца прыгожы і складаны будынак сучаснай культуры; немагчыма нават пачынаць абмяркоўваць нешта такое, што прынесла з сабой XXI стагоддзе, без таго, што было задоўга да яго. Бо ва ўсім ёсць глеба, падмурак, аснова. Традыцыя...

Напрыклад, **Аляксандр Максяшын, прафесар,** які прыехаў з Расіі, разважаў пра гэта так:

— Мінулае XX стагоддзе аказалася настолькі багатым і непрадказальным у дачыненні да новых стылёвых кірункаў, відаў, жанраў, а тым больш тэрмінаў. Напэўна, кожнаму з нас трэба быць талерантным, нармальна ўспрымаць і ставіцца да ўсяго новага пад уплывам розных цывілізацый і культур. Але не варта забываць і пра свае традыцыі, якія пакуль яшчэ падсілкоўваюць сучаснае грамадства, без якіх немагчымы каларыт любой нацыянальнай культуры і мастацтва.

Так звычайна, здавалася б, чуць гэтыя словы. Звычайнымі — да болю — яны здаюцца менавіта таму, што ў нас у Беларусі гучаць вельмі часта: праблема захавання культурных адметнасцяў і праблема пераемнасці традыцый — наогул адна з самых актуальных у сучасным свеце. Мы — не выключэнне. Але ў нейкім сэнсе — усё-такі выключэнне, пакуль што мы яшчэ шмат маем і не ўсё страцілі. Беларусі нават за час яе вельмі драматычнай гісторыі ўдалося захаваць багаты пласт фальклорнай, этнаграфічнай спадчыны, народнай культуры, той, што ў шмат якіх рэгіёнах Еўропы прыходзіцца аднаўляць штучна шляхам рэканструкцыі. У Беларусі працягвае існаваць яшчэ жывая народная традыцыя, якая нейкім чынам прарываецца скрозь уніфікаваныя і безаблічныя ўзоры масавай культуры, якая вельмі лёгка падпарадкоўвае сабе агульныя густы, і што асабліва небяспечна: густы і тых, хто мог бы быць працягам жыцця традыцыі, якая робіць нас непадобнымі на іншых. Бо калі мы падобныя — то чым тады цікавыя?

**Аляксандр Коваленя, акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар,** адзначыў:

— Нацыянальная культура ва ўмовах глабалізацыі павінна стаць галоўным фактарам нацыянальнай дзяржаўнай самаідэнтыфікацыі. Негатыўныя працэсы глабалізацыі выклікалі актыўнае распаўсюджванне ў свеце масавай культуры, нівеліраванне этнічных і нацыянальных асаблівасцяў. Сёння нам прапаноўваюцца знешне прывабныя праекты, якія часта маюць разбуральную сутнасць і накіраваныя на дэградацыю духоўнай сутнасці чалавека. Нездарма 32-я сесія генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА прыняла міжнародную канвенцыю аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Да гэтай канвенцыі далучылася Рэспубліка Беларусь. Сапраўды, існуе важная праблема пошуку месца традыцый культуры і мастацтва ў жыцці людзей і дзяржавы. На кожным этапе развіцця грамадства адной з найбольш важных задач заўсёды з'яўлялася фарміраванне гісторыка-культурнай свядомасці народа, якая ўяўляе сабой складаную і шматгранную духоўную з'яву. Асэнсаванае разуменне свайго мінулага — важнейшы фактар сувязі пакаленняў, які ўзмацняе свядомасць людзей і іх прыналежнасць да пэўнай культуры... Таму акрэслены важнейшыя задачы дзяржавы ў сферы культурнай палітыкі. Яны заключаюцца ў тым, каб падтрымліваць патрыятычны кірунак беларускай культуры, стварыць умовы для развіцця яе традыцыйных і сучасных формаў, каб, выкарыстоўваючы гэты патэнцыял, умацоўваць міжнародны прэстыж нашай краіны. Актуальнасць даследаванняў у галіне культуры і мастацтва абумоўлена заадачамі дзяржаўнага будаўніцтва Рэспублікі Беларусь і культурнага развіцця беларускай нацыі. Выяўленне і аналіз асаблівасцяў развіцця сучаснага мастацкага працэсу, традыцый, інавацый і пераемнасці з'яўляецца вельмі значным фактарам у фарміраванні нацыянальнай ідэі, фундаментальных прынцыпаў беларускай дзяржаўнасці.

У навукоўцаў, якія вывучаюць і аналізуюць беларускую культуру, сапраўды шмат працы. Яна вынікае як з нашай самабытнасці, так і з тых праблем, якія ўяўляюцца найбольш адчувальнымі і балючымі сёння і ў будучыні. Таму важна зафіксаваць формы, якія могуць знікнуць ці знаходзяцца пад пагрозай: каб потым паказваць і расказваць, як было. І важна актуалізаваць — паспрабаваць увесці ва ўжытак, нагадаць і навучыць, як было, каб людзі ведалі, чаму менавіта так, а не інакш. Важна даць і права гонару, засведчыўшы няпросты, але багаты культурны шлях Беларусі. Таму цяпер разгарнулася праца над шматтомным выданнем "Гісторыя культуры Беларусі", якое, мяркуюць, будзе актуальным і запатрабаваным у беларускім грамадстве.

Сёння асноўнымі носьбітамі традыцый лічаць жыхароў беларускай вёскі: векавая культура найбольш трывала ўтрымлівае культурна-духоўныя каштоўнасці, чым гарадская. Гэта, натуральна, цікавіць і прыцягвае навукоўцаў: цесная сувязь з жывымі носьбітамі будзе спрыяць грунтоўным даследаванням. Але ёсць і адваротны бок медаля. Гэтыя самыя людзі сёння вельмі чакаюць не проста цікавасці да сябе. Яны хочуць разумець і ведаць: што ж такога ўнікальнага ў іх вопыце, чым жа так каштоўныя іх песні, чаму ж так важна ўмець вышываць нашы традыцыйныя ўзоры і як гэта праз іх можна ўзняць эканоміку краіны? А хто патлумачыць ім? Аляксандр Каваленя засведчыў на ўласным вопыце: у рэгіёнах чакаюць і хочуць пачуць жывое слова навукоўцаў.

Папулярызаваць ёсць што: сёння ў Цэнтры даследаванняў беларускай мовы і літаратуры дзейнічае 18 аддзелаў. Уявіце: калі б кожны аддзел "пайшоў у людзі", праводзіў выязныя канферэнцыі ці "круглыя сталы", які быў бы рэзананс ад дзейнасці навукоўцаў! А галоўнае — яна была б больш набліжана да рэальнага жыцця.

**Сяргей Віцязь, намеснік дырэктара Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі:**

— Паколькі мяняецца грамадская структура, мяняецца гаспадарчы ўклад, мяняюцца сферы дзейнасці, парушаецца традыцыйная сістэма рэтрансляцыі традыцыйнай культуры. Узнікае пытанне: ці могуць навукоўцы прапанаваць нейкія механізмы і нейкія шляхі для таго, каб зафіксаваць, захаваць і рэтрансляваць культуру? Адна справа — апісаць бохан хлеба і расказаць, наколькі ён каштоўны і смачны, другая — ведаць і валодаць тэхналогіяй, якая б дазволіла такі бохан выпякаць. Тое ж тычыцца любога абраду і вобласці яго кантэксту — маральнага і выхаваўчага. Напрыклад, тое, што раней у беларускай традыцыі называлася "свята" — з адпаведным падтэкстам і зместам, накіраваным на ўнутраныя высілкі духоўнага пераасэнсавання нейкіх жыццёвых сітуацый, — сёння ў большай ступені перацякае ў вобласць менавіта свята як дзеяння... Адным са шляхоў да захавання сутнаснага сэнсу традыцый можа быць інфармацыйная сістэма, якая апісвае найбольш поўна тыя дзеянні, якія ахопліваюць найбольшы пласт нацыянальнай культуры, а таксама накіраваныя на яе сацыялізацыю і ўвядзенне ў паўсядзённы кантэкст дзейнасці. Стварэнне такой праграмы прадугледжваецца ў Цэнтры даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры.

А калі ведаеш і разумееш адметнасць традыцый, то і пра сучасную музыку і літаратуру, жывапіс, тэатр і кіно разважаць прасцей. Яны ж не ўзніклі ніадкуль...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**